***Я аздабляю нашу мову:***
***Даю прыметы розным словам.***
***Наўрад ці зможаш без мяне ты***
***Прадмет адрозніць ад прадмета.***

**Ільняная і жытнёвая.**
**Сялянская.**
**Баравая ў казачнай красе.**
**Старажытная.**
**Ты самая славянская.**
**Светлая, як травы ў расе.**
**Вобразная, вольная, пявучая,**
**Мова беларуская мая!**

**Пімен Панчанка**

*Ільняная* і жытнёвая.
Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная.
Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная, пявучая,
Мова беларуская мая!

Пімен Панчанка

Хвост мой пушысты,
Кажух мой агністы,
Хітрай называюць
І курэй хаваюць.





На градцы – доўгі і зялёны,
А ў дзежцы – мокры ды салёны.



Носікі вусатыя,
Спінкі паласатыя,
Хвосцікі пушыстыя,
Лапкі кіпцюрыстыя.

# ПРЫМЕТНІК

| ЛЕКСІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ | МАРФАЛАГІЧНЫЯ ПРЫМЕТЫ | СІНТАКСІЧНАЯ ФУНКЦЫЯ |
| --- | --- | --- |
| Абазначае прымету прадмета | Змяняецца па ліках,склонах, родах (у адз.ліку) | У сказе можа быць азначэннем або выказнікам |



**Прыметнік + назоўнік = словазлучэнне**
**Назоўнік + прыметнік = сказ**

Сіняе неба – словазлучэнне

Неба (было) сіняе – сказ




# ЗАДАННЕ

***Размяркуйце прыметнікі па групах:***

| Сіняя | Чырвоная | Зялёная | Жоўтая |
| --- | --- | --- | --- |
| 1.ПАМЕР | 1.КОЛЕР | 1.ФОРМА | 1.МАТЭРЫЯЛ |
| 2.ЗНЕШНІЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ | 2.АДНОСІНЫ ДА ЧАСУ | 2.УНУТРАНЫЯ ЯКАСЦІ | 2.ПРЫЗНАЧЭННЕ |

| Сіняя | Чырвоная | Зялёная | Жоўтая |
|---|---|---|---|
| *маленькі* стол | *блакітнае* неба, *ружовы* захад | *авальная* плошча | *залаты* пярсцёнак, *шкляны* посуд |
| *кучаравая* дзяўчына, *прыгожы* юнак | *навагодняя* ноч | *сарамлівая* дзяўчына, *добры* настаўнік | *сталовы* нож |

# Надыход зімы

Пасля палудня з поўначы падзьмула здаровым халадком. Зямля стала сухой, пакрылася цвёрдаю скарынкаю. Затым пасыпаў спорны, густы сняжок, які ішоў усю ноч і ўвесь дзень. Пад вечар снег суняўся, і на захадзе бліснула ласкавая ўсмешка сонца і патухла. У небе засвяціліся зіхатлівыя зоркі. Прыціснуў моцны мароз.

Раніцою наваколле нельга было пазнаць. Лес пабялеў, зрабіўся светлым. Кашлатыя лапы ялін гнуліся пад халодным пластом снегу, а маленькія елачкі на ўскрайку лесу і пні панадзявалі пышныя белыя башлыкі і хаваліся пад імі. І нельга было ўстрымацца, каб не памераць сваімі нагамі глыбіню снегавога покрыва.

(Паводле Я.Коласа)

- Прыметнік – гэта…
- Прыметнік у сказе звязаны з …
- Марфалагічныя прыметы прыметніка (змяняецца па) …
- У сказе прыметнік выконвае ролю (член сказа) …
- У маўленні прыметнікі ўжываюцца для…

- **Прыметнік – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? чый?**
- **Прыметнік у сказе звязаны з назоўнікам.**
- **Марфалагічныя прыметы прыметніка - лік, склон, род ( у адзіночным ліку).**
- **У сказе прыметнік выконвае ролю азначэння або выказніка.**
- **У маўленні прыметнікі ўжываюцца для таго, каб дакладна, ярка і вобразна апісаць прадмет, выдзеліць прадмет з шэрага іншых, ацаніць яго.**

# Хатняе заданне:

§33. Практыкаванне № 261(вусна).

